струкцыі з эліпсісам дзеяслова, у якіх аднародныя выказнікі звязаны сінтаксічнай сувяззю *раз'яднання* (гл. рысунак 2.21).

Найважнейшым фактарам функцыянавання эліптычных канструкцый з аднароднымі выказнікамі выступае структурна-сэнсавая абумоўленасць аднародных выказнікаў (матэрыяльна выражанага і эліпсаванага або ўсіх эліпсаваных). Разгортванне сінтаксічных пазіцый шляхам ускладнення структуры сказа дае магчымасць лексемам узаемадзейнічаць на аснове структурнай і семантычнай аднапланавасці з дапамогай рознай сінтаксічнай сувязі і адносін. Сэнсавае ўзаемадзеянне рэалізуецца ва ўзаемасувязі і ўзаемаабумоўленасці лексем, якія запаўняюць сінтаксічныя пазіцыі.

Важную ролю ў функцыянаванні эліптычных канструкцый з аднароднымі выказнікамі адыгрываюць і дапаможныя сродкі – семантычны канкрэтызатар пры далучальных злучніках, семантычная скрэпа, што прымацоўвае далучальную канструкцыю, а таксама семантычная пераемнасць кампанентаў у канструкцыях з эліпсісам дзеяслова.

2.4 Ускладнена-паўпрэдыкатыўны тып

Кампенсаторная функцыя кампанентаў зрэдку ажыццяўляецца на аснове паўпрэдыкатыўнай сінтаксічнай сувязі. Кампенсаторную функцыю могуць выконваць выключна адасобленыя акалічнасці, што ўказваюць на дадатковае дзеянне ў адносінах да эліпсаванага выказніка і па гэтай прычыне выразна адмяжоўваюць семантыку актыўнага дзеяння ад руху: *Цівун, спыніўшыся ля парога, – да гаспадара* (М. Якімовіч) або адасобленыя азначэнні, якія адмяжоўваюць семантыку статальнай лакалізацыі ад семантыкі руху: *Макрына – у бок вёскі, акамянелая і спустошаная* (С. Баранавых). Кампенсаторныя магчымасці адасобленых членаў у канструкцыях з эліпсісам дзеяслова маюць нявыражаны характар.

2.4.1 Ускладнена-паўпрэдыкатыўны тып з адасобленымі акалічнасцямі

Эліптычныя канструкцыі з адасобленымі акалічнасцямі складаюць 3 % ад агульнай колькасці фактычнага матэрыялу, або 182 адзінкі. Параметры структурнай тыпалогіі, заснаваныя на відах сінтаксічнай сувязі, што забяспечваюць кампенсаторную функцыю, дазваляюць нам вылучыць *ускладнена-паўпрэдыкатыўны тып*. Адметнай асаблівасцю названага тыпу выступае тое, што кампен-

РЕПОЗИТОРИЙ•БГПУ

саторная функцыя членаў сказа ажыццяўляецца на аснове паўпрэдыкатыўнай і далучальна-паўпрэдыкатыўнай сінтаксічнай сувязі.

Часцей назіраюцца адасобленыя акалічнасці, звязаныя з сінтаксічнай пазіцыяй выказніка *паўпрэдыкатыўнай* сувяззю (81 %) (рысунак 2.22), якая надзвычай рэдка мае дамінантны характар і вызначае сэнс эліпсаванага дзеяслова. У большасці выпадкаў семантыка падобных сказаў маркіруецца канстантным кампанентам – лакатывам: *У глыбокай даліне, нібы прытаіўшыся, – хутар з вялікім садам і стогадовай хатай* (Янка Брыль); або кампанентамі з монафункцыянальным характарам: дырэктыў-фінішам: *Ліда, усё гэтак жа сама сабе ўсміхаючыся, шклянкі і цукар – на стол…* (А. Жук); тэмпаратывам: *Ад цямна да цямна я – «Лявоніху», крукам сагнуўшыся* (М. Гарэцкі); спосабам: *І раптам гул, запаўняючы вестыбюль і лесвіцу* (А. Федарэнка); *Белазёраў, жмурачы вочы, тонкім голасам да Ваціка* (С. Баранавых) і інш. Выражаюцца такія акалічнасці пераважна дзеепрыслоўямі, а самі сказы часта выкарыстоўваюцца ў якасці загалоўкаў да інфармацыйна-публіцыстычных тэкстаў: *Па Нёмане – перасякаючы межы* («Настаўніцкая газета»).

Кампенсаторная функцыя падобных кампанентаў мае выражаны характар у эліптычных канструкцыях з поліфункцыянальным лакатыўным кампанентам.



Рысунак 2.22. – Ускладнена-паўпрэдыкатыўны тып з адасобленымі акалічнасцямі

Кампенсаторны кампанент у такіх сказах адмяжоўвае семантыку статальнай лакалізацыі: *За ракой – невялічкая вёска, прыгожа атуляючы пакручасты бераг* (Янка Брыль); *На ўзлессі, снегам абцярушаныя, марозам умарожаныя, –*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Халімонавы ды Якушавы сані (С. Баранавых); ад семантыкі руху: *Макрына моўчкі ў бок жытняга поля, раскідаючы скрадзены позірк паабапал агародаў* (С. Баранавых); *І я ў бок возера, ледзь валочучы ногі* (М. Гарэцкі); *Васька, шоргаючы нагавіцамі па асфальце, – у бок клуба* (А. Жук); *Міша – у бок вёскі, падымаючы пыл за сабою* (А. Жук); *Дзед, накульгваючы, – да лаўкі* (А. Якімовіч); *Загацкі, гуляючы, у бок пошты* (А. Жук); *Крыламі махаючы паволі, над зямлёю белай – коршуны* (А. Вялюгін). У выпадках, калі *спосаб* у эліптычных сказах мае поліфункцыянальны характар (можа спалучацца з прэдыкатамі руху і статальнай лакалізацыі), адасобленыя акалічнасці выразна маркіруюць сказ семантыкай руху, указваючы яго на спосаб: *Камунарскія дзеці роўным строем, пабраўшыся за рукі, пераступаючы далей і далей адно за другім* (С. Баранавых); *Наперадзе, выцягнуўшыся ў шнур, увесь табун аленяў* (В. Карамазаў). Аднак у большасці выпадкаў спосаб маркіруе эліптычны сказ семантыкай актыўнага дзеяння: *А чаго госць стоячы?* (Г. Марчук).

У пераважнай большасці адасобленая акалічнасць назіраецца ў эліптычных канструкцыях з канстантна маркіраванай семантыкай статальнай лакалізацыі: *А ў вачах – смугою – сіняе Палессе, // А на губах – тугою – далёкай мяты пах* (Г. Бураўкін). Намі выяўлены канструкцыі з кантэкстуальным эліпсісам, дзе адасобленыя акалічнасці ўдакладняюць зменаўнае дзеянне: *Найчасцей людзі сыходзілі раней. Адны – проста спатоліўшы цікавасць, другія – як бы выканаўшы неадменны, нялёгкі абавязак* (І. Мележ); *І ў гэты дзень тыя, што назіралі, глядзелі па-рознаму. Адны – чарляючы смяшкамі, другія – гамонячы, спрачаючыся паміж сабой, трэція – моўчкі, хаваючы ў сабе сваё думанне* (І. Мележ).

Значна радзей ужываюцца ў беларускай мове эліптычныя канструкцыі, з якімі адасобленыя акалічнасці звязаны *далучальна-паўпрэдыкатыўнай* сувязю (19 %) (рысунак 2.22). Гэта абумоўлена тым, што сэнсавая сувязь паміж часткамі ў такіх сказах паслабленая і аднабаковая: *Паштальён Валянціна Пятроўна – з адной вёскі ў другую, і ўсё пешшу* («Прыдняпроўская ніва»); *Недалёка ў лесе – птушкі, але спуджана і трывожна* (А. Карпюк). Неабходна адзначыць, што пры далучальнай сувязі кампенсаторныя ўласцівасці кампанентаў маюць нявыражаны характар. Звычайна кампанент, што ўказвае на аб’ект інтэлектуальнай дзейнасці чалавека, мае поліфункцыянальны характар. У такіх канструкцыях адасобленая далучальная акалічнасць у рэдкіх выпадках адмяжоўвае семантыку маўленчых працэсаў: *Маці ўвесь час пра ваенную маладосць, і ўсё больш з сяброўкамі* («Савецкая вёска») ад мысліцельных: *Старшыня калгаса – стары Апанас – пра нарыхтоўку кармоў, прычым увесь час, перабіраючы свае невясёлыя думкі* (А. Кудравец). Дадзеныя канструкцыі могуць маркіраваць сферу праяўлення акцыянальнай прыкметы – напрыклад, фізічнай: *Зноў недзе за вёскай – сабакі, ды гучна і голасна* (Б. Мікуліч), адмяжоўваць семантыку ўздзеяння на органы пачуццяў: *Раптам – гамонка, ды ўжо далёка, аж у канцы вёскі* (Г. Мар-

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

чук) ад семантыкі актыўнага нераўтваральнага ўздзеяння: *Недалёка – царкоўныя званы, але быццам прыглушана* (У. Шахавец). Аднак у большасці выпадкаў адасобленыя далучальныя акалічнасці назіраюцца ў эліптычных канструкцыях, дзе кампенсаторныя кампаненты маюць характар монафункцыянальны: *Пошта да нас – раз на тыдзень, ды і то не заўсёды* (У. Шахавец) або канстантны: *Зноў – выбухі, і вельмі блізка* (В. Быкаў).

Такім чынам, у канструкцыях з эліпсісам дзеяслова кампенсаторная функцыя адасобленых акалічнасцей мае нявыражаны характар. Гэта абумоўлена тым, што ў пераважнай большасці канструкцый семантыка маркіруецца кампанентамі, якія маюць канстантны або монафункцыянальны характар.

2.4.2 Ускладнена-паўпрэдыкатыўны тып з адасобленымі азначэннямі

Эліптычныя канструкцыі з адасобленымі азначэннямі ў беларускай мове адзінкавыя. Яны складаюць 1 % ад агульнай колькасці фактычнага матэрыялу, або 46 адзінак. Самі ж адасобленыя азначэнні ў такіх сказах характарызуюцца адвольным месцаразмяшчэннем адносна эліпсаваных членаў сказа, разнастайнасцю будовы і спосабаў выражэння. Іх кампенсаторная функцыя мае нявыражаны характар і рэалізуецца на аснове узаемадзеяння з сінтаксічнай пазіцыяй выказніка.

Адасобленыя азначэнні ў адзінкавых выпадках здольныя маркіраваць семантыку статальнай лакалізацыі: *Доўга Нічыпар каля Вялікага Каменя над рэчкаю, закатаваны мінуламі днямі* (С. Баранавых); семантыку руху: *Паспрабуй, акальцаваны, // Не пакруціш – папярок* (Я. Янішчыц).

У большасці выпадкаў адасобленыя азначэнні звязваюцца атрыбутыўнай або далучальнай сінтаксічнай сувяззю. Пры гэтым кампенсаторны кампанент у такіх сказах мае канстантны характар – лакатыў з указаннем на дынамічную лакалізацыю: *Мае ласкава-сумныя радкі, // Народжаныя сумнымі начамі, – у сшытак // Спешна, ад рукі. // Сустрэнуцца не хутка з чытачамі* (М. Шабовіч) або лакатыў з указаннем на статальную лакалізацыю аб’екта: *Перад фасадам дома – гародчык, абнесены частаколам* (В. Хомчанка); *За вёскай – высозныя таполі, адмытыя, адшараваныя вясной да светла-салатавай сарамлівасці* (Янка Брыль); *Кругом – палі, і даволі вялікія* (М. Зарэцкі); *За вёскай – возера, і не малое* (Кузьма Чорны).

Адасобленыя азначэнні выражаюцца дзеепрыметнікамі (55 %) і прыметнікамі (45 %) (рысунак 2.23).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



Рысунак 2.23. – Ускладнена-паўпрэдыкатыўны тып з адасобленымі азначэннямі

Такім чынам, эліптычныя канструкцыі з адасобленымі членамі сказа маюць у беларускай мове нізкую ступень частотнасці (6 % ад агульнай колькасці фактычнага матэрыялу). Іх функцыянаванне залежыць ад граматычных, камунікатыўных, сэнсавых умоў адасаблення, характару сінтаксічнай сувязі і рэгулюецца структурна-сэнсавымі моўнымі механізмамі.

Граматычныя ўмовы адасаблення спрыяюць разгортванню сінтаксічных пазіцый шляхам ускладнення структуры, што дае магчымасць лексемам узаемадзейнічаць паміж сабой на аснове рознай сінтаксічнай сувязі. Проціпастаўленне выражанага і нявыражанага (камунікатыўныя ўмовы адасаблення) прадвызначае дадатковае ўскладненне і ўзмацненне сэнсавай важнасці адасаблення. Сэнсавыя ўмовы адасаблення дазваляюць пераразмяркоўваць семантычныя функцыі кампанентаў: адасоблены член страчвае якасці дадатковага паведамлення і становіцца сэнсавай дамінантай выказвання.

Структурна-сэнсавае ўзаемадзеянне паміж адасобленым членам сказа і сінтаксічнай пазіцыяй выказніка ажыццяўляецца на аснове *паўпрэдыкатыўнай* (адасобленыя азначэнні і акалічнасці) і *далучальнай* (адасобленыя акалічнасці) сувязі. Іншыя віды сувязі (атрыбутыўная або паясняльна-ўдакладняльная) прадвызначаюць сінтаксічную сувязь з недзеяслоўнымі кампанентамі, таму з эліпсаваным выказнікам не ўзаемадзейнічаюць.

Паўпрэдыкатыўныя адносіны абумоўліваюць наяўнасць дадатковай мадальнасці і тэмпаральнасці, якая мае індыкатыўны характар.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ